| Miejsce na naklejkę z kodem szkoły | *dysleksja* ☐ | |
|---|---|---|
| | | MOB-P1A1P-052 |

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

**Arkusz I**

**POZIOM PODSTAWOWY**

**Czas pracy 170 minut**

**ARKUSZ I**

**MAJ ROK 2005**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 15 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Rozwiązania zadań zamieść w miejscu na to przeznaczonym.
3. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
4. Nie używaj korektora.
5. Błędne zapisy przekreśl.
6. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
7. Możesz korzystać ze słowników językowych.
8. Wypełnij tę część karty odpowiedzi, którą koduje zdający. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
9. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Zamaluj ■ pola odpowiadające cyfrom numeru PESEL. Błędne zaznaczenie otocz kółkiem ⦿ i zaznacz właściwe.

***Życzymy powodzenia!***

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie **70 punktów**

*21 za część 1*
*49 za część 2*

**Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy**

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

**PESEL ZDAJĄCEGO**

tylko **OKE Kraków, OKE Wrocław**

| | | |
|---|---|---|
| | | |

**KOD ZDAJĄCEGO**

**Część I – rozumienie czytanego tekstu**

**Прачытай уважліва тэкст А. Баршчэўскага.**

Аляксандр Баршчэўскі

*Беларускі літаратурны рух у польшчы ў 1958-1998 гадах*
(скарочана)

**1.** Беларускі літаратурны рух у пасляваеннай Польшчы – з'ява ўнікальная як у сваёй фармальна-жанравай спецыфіцы, так і ў тэматычных абставінах.
Гаворачы сёння аб беларускіх прадстаўніках літаратурнага руху на Усходняй Беласточчыне, нельга не памятаць аб тым, што ўжо ў царскія часы надзеленыя літаратурным талентам сыны беластоцкага краю праяўлялі сваю актыўнасць галоўным чынам пад уплывам адраджэнскіх ідэалаў «Нашай нівы» (1906-1915), якая змяшчала на сваіх старонках паведамленні, артыкулы і вершы аўтараў з Сакольшчыны, Бельшчыны, Гайнаўшчыны, што ўваходзілі тады ў склад Гродзенскай губерні. […] На Гродзеншчыне, зрэшты, таксама, як і на іншых беларускіх землях, аж да першай нямецкай акупацыі ўвогуле не існавала беларускае школьніцтва. […]

**2.** Як гэта ні дзіўна, але […] першы раз у гісторыі Беларусі нямецкія вайскова-адміністрацыйныя ўлады далі дазвол на арганізацыю беларускага школьніцтва на пачатковым і сярэднім узроўнях. […]
Аднак у міжваенны перыяд на Беласточчыне не выдаваліся беларускія газеты і не друкаваліся беларускія кніжкі, не было таксама якой-колечы літаратурнай арганізацыі беларускіх пісьменнікаў.

**3.** Пасля разгрому Польшчы нямецкай і Чырвонай арміяй і далучэння не толькі Усходняй, але і Заходняй Беласточчыны да савецкай Беларусі беларускія школы пачалі ўзнікаць не толькі на тэрыторыях, заселеных беларусамі, але і на землях спрадвеку этнічна польскіх, на захад ад горада Беластока. У самім Беластоку ўзнік аддзел Саюза пісьменнікаў БССР і пачала выходзіць беларуская газета «Вольная праца», якая друкавала дадатак «Літаратурная старонка», дзе час ад часу паяўляліся наогул няспелыя творы беларускіх аўтараў. У перыяд нямецкай акупацыі ў Беластоку друкавалася беларуская газета «Новая дарога».[…]

**4.** Беларускае школьніцтва пад час нямецкай акупацыі на Беласточчыне амаль што не існавала[…] хаця афіцыйна беларуская асвета не была забаронена. Карэнным чынам сітуацыя беларускага слова змянілася пасля адыходу нямецкай арміі з Усходняй Беласточчыны […] паўстала даволі густая сетка школ, у якіх выкладалася беларуская мова. Праўда, асветніцкая палітыка пасляваеннай Польшчы не была паслядоўнай. […]

**5.** Толькі праз тры гады пасля смерці Сталіна, […] палітычныя ўлады Польшчы пастанавілі адступіць ад тэзісу аб аднанацыянальным характары польскай дзяржавы і […] прызнаць існаванне нацыянальных меншасцяў. […] Зрэшты, не толькі прызнаць тэарэтычна, але і дазволіць ім паклікаць да жыцця грамадска-культурныя таварыствы, для якіх былі вызначаны пэўныя фінансавыя сродкі на штаты, аматарскі рух і, што самае важнае, дазволілі выдаваць друкаваныя органы і кнігі. Новыя магчымасці скарысталі ўсе нацыянальныя меншасці, у тым ліку і беларусы.

**6.** Ужо ў першыя месяцы 1956 года ў Беластоку ўзнікла Беларускае грамадска-культурнае таварыства і пачаў выдавацца яго друкаваны орган «Ніва», а праз год пачаў выходзіць у форме кнігі «Беларускі каляндар». Амаль ад самага пачатку як «Ніва», так і «Беларускія календары» пачалі даволі часта друкаваць вершы, апавяданні, фельетоны мясцовых аўтараў. Такім чынам, быў створаны спрыяльны грунт пад сяўбу роднага беларускага слова.

**7.** Вялікую ролю ў гэтым высакародным працэсе адыграў Георгій Валкавыцкі, шматгадовы галоўны рэдактар «Нівы» і выдатны дзеяч Беларускага таварыства. Дзякуючы яго добразычлівасці і дапамозе кагорта беларускіх творцаў пачала хутка расці і павялічвацца, а мастацкі ўзровень іх вершаў і апавяданняў узнімацца на ўсё вышэйшы ўзровень. […] Асноўная маса паэтаў і празаікаў выводзілася з вёсак і мястэчак Усходняй Беласточчыны, і гэта былі наогул маладыя людзі, як правіла, вучні ліцэяў або студэнты. […]

**8.** Пераўтварэнні, асабліва тыя, што датычыліся новай палітыкі ў адносінах да нацыянальных меншасцяў, сталіся спрыяльным стымулам да развіцця той духоўнай сферы, якой з'яўляецца літаратурная творчасць. У гэтай галіне беларусы выперадзілі іншыя нацыянальныя меншасці. І старонкі «Нівы», і старонкі «Беларускіх календароў» запаўняліся родным паэтычным і празаічным словам, а беларускія творцы ўсё часцей паяўляліся ў рэдакцыі «Нівы» або ў Галоўным праўленні БГКТ. Многія з іх пачалі прапагандаваць ідэю стварэння беларускай літаратурнай арганізацыі.

**9.** І такая структура была паклікана да жыцця ў сярэдзіне 1958 года пад назовам Беларускае літаратурнае аб'яднанне. Старшынёй гэтай арганізацыі амаль аднагалосна быў выбраны вядомы нам Георгій Валкавыцкі, выпускнік Літаратурнага інстытута імя М. Горкага ў Маскве, галоўны рэдактар «Нівы» і грамадскі старшыня БГКТ, які […] праз два гады перадаў уладу новаабранаму старшыні Аляксандру Баршчэўскаму. І гэта новы старшыня, а не хтосьці іншы, як гэта пішуць некаторыя даследчыкі, запрапанаваў узбагаціць тэрмін «Беларускае літаратурнае аб'яднанне» назовамі «Рунь», «Пошук» або «Белавежа». Удзельнікі семінара выказаліся за назву «Белавежа», і так яно засталося і да сёння. Георгій Валкавыцкі ўвайшоў у гісторыю беларускага руху ў Польшчы таксама дзякуючы таму, што падрыхтаваў, адрэдагаваў і выдаў першы калектыўны зборнік «Рунь», у якім замясцілі свае вершы 17 беларускіх паэтаў. […]

**10.** Пасля ўзнікнення беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа» аўтарскія сустрэчы з дарослымі жыхарамі Беласточчыны, з вучнямі пачатковых школ і ліцэйскай моладдзю сталіся амаль што паўсядзённай практыкай. Белавежцы правялі болей чым 3000 такіх сустрэч. Віктар Швед на працягу многіх гадоў вёў статыстыку сваіх аўтарскіх спатканняў і, зафіксаваўшы іх болей чым 1200, спыніў свой спісак. […] Да вялікіх дасягненняў белавежцаў трэба залічыць і тое, што яны апублікавалі тысячы сваіх твораў на сотнях літаратурных старонак «Белавежы» – органа Беларускага літаратурнага аб'яднання, які ў якасці дадатку да «Нівы» друкаваўся 40 год. […].

**11.** Нельга абыйсці маўчаннем тое, што апрача сціплага калектыўнага зборніка «Рунь» Беларускае літаратурнае аб'яднанне падрыхтавала і выдала ў Мінску другі калектыўны зборнік – «Літаратурная Беласточчына». У самім Беластоку былі выдадзены такія літаратурныя альманахі, як «Мой родны кут», чатыры нумары альманаха «Белавежа» і беларуска-польскі альманах «Гасцінец» („Gościniec").

Зразумела, што найвыдатнейшым здабыткам кожнага творцы з'яўляецца яго індывідуальная кніжка. А такіх кніжак у белавежцаў, уключаючы творы мастацкія, мемуарныя, публіцыстычныя, навуковыя і перакладчыцкія, ужо даўно

больш за 50, што з'яўляецца істотным укладам у развіццё беларускай духоўнасці ў Польшчы.

**12.** Праявай прызнання высокага ўзроўню беларускіх творцаў з'яўляецца тое, што больш чым 10 з іх прыняты ў Саюз польскіх пісьменнікаў і Саюз беларускіх пісьменнікаў..

А.Баршчэўскі, *Творцы беларускага літаратурнага руху ў Польшчы 1958-1998,* Мінск 2001, с. 5-10.

## Заданні да тэксту

Адкажы на пытанні. Пішы коратка, згодна з патрабаваннямі.

**Заданне 1.** ***(1 пункт)***
Прыведзены вышэй тэкст апавядае пра:
а) беларускае нацыянальнае адраджэнне
б) беларускія выдавецтвы ў Польшчы
в) пачаткі і развіццё беларускага літаратурнага руху ў Польшчы

**Заданне 2.** ***(2 пункты)***
Ва ўступнай частцы артыкула пра беларускі літаратурны рух ў Польшчы А. Баршчэўскі ўспамінае пра пачаткі беларускамонай творчасці ва Усходняй Беласточчыне.
У 1-ым абзацы знайдзі назву і гады выхаду часопіса, які змяшчаў «паведамленні, артыкулы і вершы аўтараў з Сакольшчыны, Бельшчыны, Гайнаўшчыны». Адкажы 1-2-ма сказамі.

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

**Заданне 3.** ***(1 пункт)***
У склад якой губерні ў царскія часы ўваходзіла Сакольшчына, Бельшчына, Гайнаўшчына? Адзнач правільны адказ.
а) Брэсцкай
б) Беластоцкай
в) Гродзенскай

**Заданне 4.** ***(1 пункт)***
Аўтар у 2-ім абзацы ўжыў словазлучэнне «далі дазвол; даць дазвол». Падбяры сінонімы да гэтага словазлучэння.

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

**Заданне 5.** ***(2 пункты)***
На аснове 3-яга абзаца напішы ў 2-3-х сказах, якія беларускія газеты выходзілі ў час II Сусветнай вайны.

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

**Заданне 6.** ***(2 пункты)***
Творы беларускіх аўтараў, што час ад часу паяўляліся ў «Беларускай старонцы» акрэсліў аўтар словам «няспелыя». Карыстаючыся 3-ім абзацам, падай значэнні гэтага слова і вызнач, у якім значэнні ўжыў яго А. Баршчэўскі?

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

**Заданне 7.** ***(1 пункт)***
Падбяры сінонімы да слоў. Карыстайся 3-ім, 4-ым і 5-ым абзацамі.

спрадвеку – ..........................................(3)

сітуацыя – .............................................(4)

пастанавіць – ........................................(5)

**Заданне 8.** ***(1 пункт)***
У якім годзе і дзе было паклікана да жыцця Беларускае грамадска-культурнае таварыства? Адзнач правільны адказ, карыстаючыся 6-ым абзацам.
а) 1953 г. у Варшаве
б) 1956 г. у Беластоку
в) 1958 г. у Беластоку

**Заданне 9.** ***(2 пункты)***
На аснове 5-ага і 8-ага абзацаў напішы, якія пераўтварэнні паўплывалі на развіццё беларускага слова ў Польшчы. Адкажы 1-2-ма сказамі.

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

**Заданне 10.** ***(1 пункт)***
У якім абзацы піша аўтар пра ролю «Нівы» і «Беларускіх календароў» у развіцці беларускага слова? Адзнач правільны адказ.
а) у 6-ым абзацы
б) у 7- ым абзацы
в) у 5-ым абзацы

## Заданне 11. *(3 пункты)*

На аснове 7-ага і 9-ага абзацаў вызнач ў 2-3-х сказах ролю Георгія Валкавыцкага ў фармаванні беларускага літаратурнага руху ў Польшчы.

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

## Заданне 12. *(1 пункт)*

У якім годзе была створана беларуская літаратурная арганізацыя? Якую назву Беларускаму літаратурнаму аб'яднанню выбралі ўдзельнікі семінара? Карыстаючыся 9-ым абзацам, адзнач правільны адказ.

а) у 1960 г.: «Рунь»
б) у 1958 г.: «Белавежа»
в) у 1956 г.: «Пошук»

## Заданне 13. *(1 пункт)*

Якой функцыі не поўніць тэкст? На падставе аналізу тэксту, адзнач правільны адказ.

а) інфармацыйная
б) прагматычная (практычная)
в) эстэтычная

## Заданне 14. *(2 пункты)*

Зрабі абагульненне 10-ага, 11-ага і 12-ага абзацаў. Вызнач адным сказам асноўную думку.

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

**Część II – pisanie własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu.**
**W tej części znajdują się dwa tematy. Wybierz jeden i napisz wypracowanie.**
**Wybrany temat podkreśl.**

Тэма 1: **Аб чым марыць Міхась? Аналізуючы дадзеныя ніжэй фрагменты паэмы Якуба Коласа *Новая зямля,* звярні ўвагу на сувязі роздумаў Міхала пра службу ў пана з ягонымі ўяўленнямі аб зямлі.**

Якуб Колас

*Агляд зямлі*

Прайшло ў Парэччы лет нямала;
Яно ж не цешыла Міхала,
Хоць тут мясцінка гожа, міла
І так гарнула, так хіліла
К сабе і лесам і лугамі,
І старасвецкімі дубамі!
Ды што краса без аўладання?
Адно пустое парыванне
У цьме далёкі блеск зарніцы:
Усё гэта – скарбы чужаніцы,
Магната князя Радзівіла,
А ты, пакуль ёсць рух і сіла,
Служы панам, збірай іх крошкі
І ведай цьмяныя дарожкі
Батрацкай долі да магілы,
Служы, пакорны і пахілы,
Служы з-за панскага агрызка
І заўжды гніся нізка-нізка!
Няўжо ж і век прабыць слугою
І чуць пагрозу над сабою,
Што пан у кожную хвіліну
Цябе пагоніць як скаціну?
Пагоніць вон без разважання,
Бо пан не мае спагадання,
Што трэба жыць з сям'ёй на свеце,
Што ты не рыба тая ў сеці,
Не маеш волі, ні разгону,
Што ты не чуеш жыцця звону,
Што гэты свет табе завязан
І шлях прасторны твой заказан.

А дзе ж той выхад? Дзе збавенне
З няволі цяжкай, з паланення?
Адзін ён ёсць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ралля:
То – наймацнейшая аснова
І жыцця першая умова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,

Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх не кіне,
Зямля – аснова ўсёй айчыне.

Міхал у часе вандравання,
На адзіноце сам з сабою,
З гарачым сэрцам і душою
Развязваў важнае пытанне
Аб той зямельцы аб уласнай.
Яна свяціла зоркай яснай,
Яна гарнула і хіліла,
Бы нейкі чар нязнаных сіла.
Свая зямля, свая пасада!..
Ці ёсць мацнейшая прынада?
Міхал станоўка, ненарокам
Ішоў да мэты крок за крокам.
Ён паскупеў і нават значна.
Што ж? Лепей з’есці не так смачна,
Загнаць запас на хлеб, на сала,
Абы капейка перапала,
І лішні выгадаць рубель
Ды палажыць яго ў кашэль.
Наогул трэба жыць больш змысла
І больш мяркоўна, болей сцісла,
Трымаць зачыненымі губкі
І меней траціць на пакупкі.
І так паціху ды памалу
Прыбралі трохі капіталу,
Каб хоць пачатачак зрабіць
І першы камень залажыць
На грунце вольнае зямелькі,
Адной-ядынай збавіцелькі
Ад панскай ласкі і апекі,
І плюнуць ім за тыя здзекі,
Што так уеліся ўжо ў косці,–
Калом зямля вам, ягамосці!
Цаною доўгага шукання,
Парады, спрэчак, разважання
І гэтых мыслей натужэння
І нястрыманага імкнення
Не знаць ні службы той, ні пана
Была зямелька апытана.

Фрагмент раздзела XXVI *«Агляд зямлі»* з паэмы Я. Коласа *Новая зямля* – кн.: Сянкевіч В., Грыгарук Я., *Беларуская літаратура.* Хрэстаматыя для сярэдніх школ, Варшава 2001, с. 152-154.

Тэма: 2: **Хведар Роўба – ахвяра сталінскай калектывізацыі. На аснове ніжэйдадзеных фрагментаў аповесці В. Быкава *Аблава* прадстаў трагічны лёс Хведара Роўбы. Звярні ўвагу на яго прывязанасць да роднай зямлі, да пакінутай гаспадаркі, а таксама на яго адносін да савецкай улады.**

Васіль Быкаў

***Аблава***
(выбраныя фрагменты)

[...] Быў ён немаладога веку, даўгалыгі і шырокі ў плячах, але надта худы, з жылаватай выцягнутай шыяй. На даўно не голеным твары чырванеў даўгі прастуджаны нос, з-пад светлых броваў насцярожана зыркалі шэрыя вочы. [...]

Відаць было па ўсім, што чалавек даўно ішоў адзін, звыкся са сваёй адзінотай і старанна абмінаў людзей. Людзі для яго былі найвялікшаю небяспекай у полі, на дарогах, ці не таму ён выбіраў шлях воддаль ад дарог, паселішчаў, між параснікаў і балацявін або цераз лес. [...] Ісці спакойна ўжо не ставала сілы, – усё ў ім імкнулася наперад, туды дзе на ўзлеску павінна было паказацца поле і ягоная асірацелая без гаспадара сядзіба. Канешне, не пустуе, хтось там жыве... А няшчасны гаспадар, здаецца, траціў развагу ад нецярпення, узрушэнне калаціла яго нервовай дрыжыкай, так хацелася яму зглецзець хутчэй дранкавы дах[1] з чырвоным комінам, саламяныя стрэхі хляўкоў, гародчык пад вокнамі, некалі поўны вяргіняў, яблынькі ў садку па-над сажалкай. [...]

Ён выбраўся на ўзлесак. [...] За ім віднеліся ўдалечы крайнія хаты Нядолішча – стрэхі хляўкоў, садкі і платы ля гародаў. [...] Але дзе ж ягоная сядзіба, дзе хаты і будынкі? На раўнінным, трохі пакатым[2] пляцы надзелу з слабенькай восеньскай рунню гойдалася на ветры некалькі велікаватых ужо дрэў садка, ніводнай жа будыніны не было побач. Скрозь ляжаў прасцяг голага поля – ад лесу аж да самай сажалкі ўнізе.

Хведар яшчэ ішоў, нязграбна шоргаючы пасталамі ў сухім быльнягу[3] ля ўзлеску, але сілы яго ўсё марнелі, крок рабіўся ўсё цяжэйшы, і ён стаў. Пасля вяла[4] апусціўся на ўзмежак[5] ля альховых кустоў і знерухомеў.

Ну во і дабрыў. Дапяўся. Бадай што праз тры месяцы неверагоднага шляху, пакут і цярпення. Але на што было спадзявацца і на што наракаць? Чаго ён хацеў? На што разлічваў? Найперш, каб пабачыць. Ну вось і пабачыў... Ці тут павінен яго хто сустракаць, хто прывячаць[6]* – уцекача з таго свету? Ці хоць бы ашчаджаць яго пакінутую сядзібу – мусіць пайшла на патрэбу іншым. [...] А зямля?.. Зямля во засталася і нават зелянее рунню. [...]

Нядаўняе ўзрушэнне патрохі міналася, ён ужо болей спакойна стаў пазіраць на знаёмае з дзяцінства поле, палетак азіміны, рэдкія адзінокія дрэўцы. [...] Хведар прагна азіраў наваколле, узіраўся ў панадворкі, але найбольш ягоную ўвагу прыцягвала сваё колішняе жытло[7]. Здавалася яму, што ля ўцалелага садка ўсё ж застаўся нейкі няпэўны след ад ягоных будынін, можа, не ўсё там панішчана. Адгэтуль відаць быў густы зараснік быльнягу, нешта грувасцілася там – на месцы падмурка, ці што. І ён

[1] дранкавы – z desek
[2] пакаты – spadzisty
[3] быльняг – bylica
[4] вяла – ociężale
[5] узмежак – miedza, skraj miedzy
[6]прывячаць – witać
[7] колішняе жытло – dawna siedziba, dom

думаў, што трэба ўсё ж дабрысці туды, паглядзець, хоць бы памацаць зямельку, якая некалі абяцала яму столькі радасці, а дала – адно гора. [...]

Але што было рабіць далей, ён не мог даўмецца. Ён збіўся з панталыку[8] ў гэты вечар на сваім котлішчы[9] і стаяў, бы аглушаны, раптам страціўшы ўсе жаданні. Галоўнае – страціў мэту, якая вяла яго доўгія тыдні праз усе нягоды і пакуты сюды, на родныя гоні, у свой кут. Што яго чакае тут, ён, бадай, не думаў, усё былое стала для яго няважным. Нядаўна яшчэ галоўным было – дайсці, хоць дапаўзці, каб хоць адным вокам зірнуць і памерці. О, памерці тут, знайсці вечны прыстанак у родным кутку было б найвялікшым шчасцем, пра якое ён не адважыўся і марыць...

Але што рабіць, пакуль ён жывы, куды падацца? Пайсці да каго ў вёску ён не меў права, каб не наклікаць на людзей бяды ды і сябе не выдаць міліцыі. Пакуль яго ніхто з вёскі не згледзеў, ён мог разлічваць на нейкую тут волю, якая адна яго і натхняла, давала жыць. А калі ўбачаць, пазнаюць, мусіць, тады ўсё і скончыцца. Тады зноў тое, што горш за пагібель. Тады ўжо хай смерць. Але цяпер ужо ў сваім кутку. Ужо да смерці яго адгэтуль не вытураць. [...]

Ён раптам наважыўся прайсці па начной вуліцы, зірнуць на знаёмыя хаты. [...] Ціханька прайшоў каля гародчыка Зыркаша, пра якога цяпер не хацеў нават і думаць. Сапсаваў гэты Зыркаш яму ўсё жыццё (і мабыць, не аднаму яму), быў чалавек зайздрослівы і нядобры: колісь напісаў скаргу на яго за малатарню, з якой усё і пачалося. Калі б не тая яго заява, можа б, усё і абышлося, і Хведар не туляўся б цяпер паначы, як злодзей, жыў бы разам з усімі, і не спазнаў бы тых пякучых няшчасцяў, якіх шчодра адмераў яму ягоны халерны лёс. [...]

Але, мусіць, тады нічога ўжо не ўратавала б, малатарня была толькі прычэпкай. [...] Нічога, мабыць, ужо не магло ўратаваць, калі хтосьці надзяліў яго паганым і страшным словам «кулак». [...]

Божа мой, Божа, чаму мне выпала гэткая доля? Чаму я такі бядак? Хто ў мяне ўкраў шчасце і цяпер палюе за маім жыццём? Хіба я такі грэшны перад людзьмі ці перад Богам? Каб я забіў, абакраў ці хоць зняважыў – каго? Заўжды стараўся як найлепш, барані Бог, каб хто пакрыўдзіўся, не папракнуў[10] знарок ці з непаразумення. Заўжды пачціва ставіўся да ўлады, быў шчыра ўдзячны ёй за зямлю, за шчодрасць да бедняка, нядаўняга фальваркоўскага парабка. Ды і як жа інакш – Савецкую ўладу лічыў сваёй, сялянскай уладай. [...] І ён верыў. Ён гатовы быў усім пра ўсё верыць, бо сам не хлусіў ніколі, нікога за жыццё не ашукаў.

Хто ж ашукаў яго? І ашукаў так жорстка, бязлітасна, на ўсё жыццё? [...]

Выбраныя фрагменты з аповесці: *Васіля Быкава «Аблава»* – Быкаў В., *У тумане*, Мінск 1989, с. 313, 314, 316, 317, 318, 322, 325, 360, 361, 369, 370.

[8] збіцца з панталыку – pomylić się, stracić pewność siebie
[9] котлішча – siedziba
[10] папракаць – wytykać, wypominać

# CZYSTOPIS

# BRUDNOPIS